# БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

ГАЗЕТА ЎЗНАГАРОДЖАНА ГАНАРОВАЙ ГРАМАТАЙ ВЯРХОЎНАГА САВЕТА БССР

'91

ЧАЦВЕР 7 САКАВІКА

№ 6(1670)

ГАЗЕТА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА.


## ЧЫРВОНЫ РАДОК

*27—28 лютага ва універсітэце адбылася Рэспубліканская навукова-практычная канферэнцыя «Канцэпцыя Канстытуцыі БССР і фарміраванне прававых асноў грамадзянскага грамадства і дзяржавы». Раней такога не было, каб вучоныя яшчэ да прыняцця ацэньвалі праект асноўнага закона нашага жыцця.*

* * *

*У канцы снежня мінулага года Савет Міністраў рэспублікі зацвердзіў, нарэшце, Рэспубліканскую навукова-тэхнічную праграму па стварэнню і выпрабу апаратуры і абсталявання для забеспячэння радыёметрычнага і дазіметрычнага кантролю.*

*Складаюць праграму пяць раздзелаў, якія ўключаюць 22 пункты. Выканаўцамі дзесяці з іх з'яўляюцца прадстаўнікі універсітэта — НДІ ЯП, кафедры ядзернай фізікі і радыяцыйнай хіміі. Іх задача — стварыць гаму канкурэнтаздольных прылад для радыёметрычнага і дазіметрычнага кантролю, якія б адпавядалі сусветным патрабаванням.*

## НАШ ЧАЛАВЕК — ЭКСПЕРТ

# НЕ БОГІ ЗАКОНЫ ПРЫМАЮЦЬ

**Загадчык кафедры дзяржаўнага права і савецкага будаўніцтва, прафесар Анатоль Аляксандравіч ГАЛАЎКО актыўна ўдзельнічае ў падрыхтоўцы праектаў законаў з 1954 года. Няблачная работа вучоных і вопытных практыкаў у іх асяроддзі доўгі час лічылася адказнай і няўдзячнай. Рыхтавалі, напрыклад, праект закона «Аб пасялковым, сельскім Савеце народных дэпутатаў». Анатоль Аляксандравіч настойваў: «Аб'ядноўваць адным законам два звяны Саветаў — непісьменна!» Яму адказалі: «Але ж загадана...»**

*— Цяпер інстытут прававых экспертаў дзейнічае афіцыйна. Чым, на Ваш погляд, гэта абумоўлена?*

— Для нараджэння, згодна з законамі цэнтра», братоўбліznятаў у Беларусі, Таджыкістане, Узбекістане праверка таго, што задумана ў ідэі намечанага закона, была непатрэбна. У час жа самастойнай законатворчай работы, каб распрацаваны закон адлюстроўваў патрэбы жыцця рэспублікі і эфектыўна ўздзейнічаў на развіццё акрэсленага кола адносін, неабходны глыбокі навуковы падыход, якім, на жаль, не заўсёды валодаюць дэпутаты.

Новы закон не ўзнікае на пустым месцы. У яго заўжды свая гісторыя: што было, што састарэла, што засталося актуальным. Праект кожнага закона не мае права канфліктаваць з ўжо прынятымі, уносіць дысананс у грамадскае жыццё. Асаблівыя патрабаванні ў высокаінтэлектуальнага грамадства і да стыля выкладання, пісьменнасці, дасціпнасці.

Здараецца, распрацаваны закон проста незразумелы народу — слабы механізм рэалізацыі. Гэта вялікая бяда — закон ёсць і няма, а прававая дзяржава без панавання закона не ў стане існаваць.

*— Такім чынам, роля эксперта — «вылоўліванне» памылак у кантрольных работах дэпутатаў?*

— Яна неадназначная. У нейкай ступені эксперт — саўтар гэтых работ. І калі працуе над праектам у складзе рабочай камісіі. І калі па просьбе Вярхоўнага Савета выносіць прысуд — афіцыйнае заключэнне па праекту закона, дзе адзначае станоўчыя моманты і ўносіць прапановы па ўдасканаленню праекта па сутнасці і па форме.

*— Большасць прымаемых нарматыўных актаў датычаць непасрэдна вашай спецыяльнасці — дзяржаўнага права?*

— Праз мае рукі прайшлі амаль усе праекты новых законаў Беларускай ССР. Сярод іх: «Аб мясцовым самакіраванні і мясцовай гаспадарцы», «Аб грамадзянстве», «Аб пастаянных камісіях Вярхоўнага Савета БССР», «Аб дапаўненнях і зменах у канстытуцыі БССР», «Аб выбарах народных дэпутатаў БССР»...

*— Анатоль Аляксандравіч, ці заўсёды дэпутаты згаджаюцца з Вашымі заўвагамі?*

— Яны ацэньваюць праект закона цалкам і не ведаюць, якія з частак дапрацаваны экспертамі. А ў адпаведных камісіях большасць паправак прымаюцца.



Добрая частка універсітэцкіх студэнтаў працягвае дыхаць у такт цяжкому подыху ўдзельнікаў танцавальнага марафону. Толькі засталося іх ужо шасцёра — тры пары замест васьмі, што стартавалі 24 лютага. У другім туры, 3 сакавіка, усё вырашылася з дапамогай звычайнага паветранага шарыка. Калі парам давялося танцаваць, прытрымліваючы яго з двух бакоў адначасова з рытмічнымі рухамі, пяць з іх пaступова здаліся... Пэўна, вы хварэлі за каго-небудзь з іх — за № 1 ці 3, 5 ці 6, або за № 8? Можа, яшчэ і давядзецца ўбачыць, як цудоўна яны танцуюць, толькі не ў якасці марафонцаў, а проста на дыскатэцы. 7 сакавіка, напярэдадні свята, барацьбу будуць працягваць Алена КРЫЛОВІЧ і Віталь ГАЎРУСЕЎ (№ 2), Наталля ПЕТРЫКАВА і Андрэй МАТВЯЙКОЎ (№ 4), Іна КРАКОТНІК і Алег СЕВЯРЫНЧЫК (№ 9). Прыходзьце а 16-й гадзіне! Вас зноў чакаюць танцы да ўпаду, азартны таталізатар і — самае цікавае — вырашэнне лёсу 1000 рублёў. Вы можаце прадказаць, каму яны дастануцца?

НА ЗДЫМКАХ: імгненні другога тура марафону.

Фота А. ГУСАКА.

## ШУКАЕМ ВЫЙСЦЕ

# Ці зручна быць анархістам?

Я хацела б зноў вучыцца ў БДУ. Студэнт сённяшнім днём — чалавек. Валодае правам выбіраць лектара па душы і быць выбраным у вышэйшы орган кіравання вузаўскім жыццём — вучоны савет. І «фортка» з раніцы да апошняй пары — не злосны ўчынак, а высакароднае, калі хочаце, выражэнне ўласнага меркавання, да якога выкладчык у сілу індывідуалізацыі навучання абавязаны прыслухацца.

Я не хацела б зноў вучыцца ў БДУ. Бо што рабіць са сваім правам, студэнцкая фракцыя ў вучоным савеце ніяк не вырашыць, а доўгачаканая самастойнасць абарочваецца ўстойлівай тэндэнцыяй да зніжэння паспяховасці. 1606 «хвасцістаў» зімовай сесіі — прыклад гэтаму.

У чым прычына?

— Відавочна, у тым, што кожны закон можа працаваць толькі тады, калі грамадства аб'ектыўна падрыхтавана да яго,— сцвярджае прарэктар Пётр Дзмітрыевіч КУХАРЧЫК.— У адваротным выпадку эфект аказваецца адмоўным. Два гады назад, «раскрэпасціўшы» студэнтаў вольным наведваннем, мы меркавалі, што яны пойдуць у бібліятэкі, чытальныя залы, на кафедры да выкладчыкаў. Аднак большасць з іх... засталіся ў інтэрнатах. А для першакурснікаў «вольнае жыццё» параўнальна са стыхійным бедствам. Яны не навучыліся яшчэ працаваць з кнігай, таму пропуск дзвюхтрох лекцый пагражае цяжкасцямі пры ўспрыманні наступнага матэрыялу.

Калі ўлічыць існуючы каэфіцыент: адзін выкладчык на дзевяць студэнтаў, не спраўджваюцца і надзеі, ускладзеныя на індывідуальныя заняткі. Адны выкладчыкі застаюцца вернымі звычайным практычным і семінарскім, другія прапануюць студэнтам пісьмовую работу. Трэція лічаць, што адпрацоўваюць сваё ў час кансультацый. Атрымалася, што прынеслі новаўвядзенні толькі няязручнасці.

І трэці момант. Сёння права выбару студэнтамі лектара проста дэкларавана. Вельмі вузкае кола лектараў чытае многія вучэбныя дысцыпліны за выключэннем хіба толькі грамадскіх навук.

Што мы можам зрабіць для адчувальных паляпшэнняў у вучэбнай рабоце акрамя мер адміністрацыйнага характару: павышэння патрабаванняў да абітурыентаў, захавання правілаў допуску да экзаменацыйнай сесіі, паступовага пераходу да больш аб'ектыўнай пісьмовай формы прыёму экзаменаў, укаранення рэйтынгавай сістэмы? Наладзіць самыя цесныя кантакты з усімі арганізацыямі, для якіх рыхтуем спецыялістаў, каб прывесці наш выпуск (і набор) у адпаведнасць з рэальнымі патрэбамі народнай гаспадаркі. Ці ў стане любы з дэканаў даказаць, што спецыялістаў таго ці іншага профілю патрабуецца менавіта 10, а не 5 ці 20? Ды і перагібы ў стварэнні кафедраў будуць ліквідаваны, калі мы пачнём працаваць на заказчыка.

Інфармацыйны выбух ва ўсіх галінах ведаў прывёў да таго, што ў акрэсленую колькасць гадзін мы імкнуліся «ўціснуць» максімум інфармацыі, ператварыўшы вучэбныя дысцыпліны ў апісальна-тэарэтычныя. Надышоў час перагледзець і вучэбныя планы, і змест вучэбных дысцыплін. Калі гэта задача будзе вырашана, то ўсе астатнія — павышэнне пазнавальнай актыўнасці студэнтаў, актывізацыя методыкі навучання, індывідуалізацыя навучання — будуць справай тэхнікі.

У XVIII стагоддзі вядомы нямецкі асветнік Г. Ліхтэнберг адзначыў: «Хто не разумее нічога, акрамя хіміі, той і яе разумее недастаткова». А мы практычна забыліся, што універсітэт павінен рыхтаваць не толькі спецыялістаў высокага класа, але і шырокаэрудзіраваных, інтэлігентных людзей. Не ў меншай ступені важна павысіць эрудыцыю студэнтаў гуманітарных факультэтаў у галіне прыродазнаўчых навук.

Так што прычыны высветлены, мэты акрэслены, засталася задача не менш складаная: іх дасягнуць.

## ДЛЯ ТЫХ, ХТО АДСУТНІЧАЎ

# Што далей фразы?

Нарада гэта была звычайная — рабочая. Прарэктар Сігізмунд Адамавіч МАЛЕВІЧ запрасіў на яе намеснікаў дэканаў факультэтаў, якія курыруюць пытанні завочнага і вячэрняга навучання, загадчыкаў кафедраў, метадыстаў.

— На жаль, на вячэрняй і завочнай формах навучання,— адзначыў С. А. Малевіч,— у краіне, гаворачы мовай юрыстаў, склалася крымінагенная сітуацыя. Паспяховасць студэнтаў няўхільна зніжаецца. Губляецца галоўнае — імкненне да атрымання выдатных ведаў, застаецца другаснае — жаданне любым шляхам атрымаць дыплом аб вышэйшай адукацыі!

Паколькі ў бліжэйшыя гады, калі ідзе размова аб увядзенні платнага навучання, колькасць вячэрнікаў і завочнікаў наўрад ці зменшыцца, усім, хто мае дачыненне да арганізацыі вучэбнага працэсу на завочным і вячэрнім аддзяленнях, неабходна падумаць, як стабілізаваць сітуацыю.

У першую чаргу патрабуюць неадкладнага перагляду вучэбныя планы. Тэмы і заданні кантрольных работ таксама ўжо «з барадой». Узнікла неабходнасць падумаць над больш эфектыўнай і карыснай арганізацыяй вытворчай і педагагічнай практык. Што датычыць дня завочніка, то ў нас студэнты чамусьці ўспрымаюць яго як магчымасць ліквідаваць запазычанасці, а не як дзень цікавых пазапланавых лекцый, гутарак, «знаёмстваў» з камп'ютэрам...

Відаць, пытанне гэта сапраўды балючае, бо жадаючых выступіць было шмат. Вось, напрыклад, што сказаў загадчык кафедры беларускай мовы і літаратуры для прыродазнаўчых факультэтаў У. А. Навумовіч:

— Зараз прадметы беларускамоўнага цыкла патрэбна чытаць шырэй — як гісторыю мовы, культуры, літаратуры, мастацтва, традыцый. Кафедра можа забяспечыць гэта: у нас ёсць неабходныя спецыялісты, распрацаваны вучэбныя планы.

З усіх працэсаў, якія трывожаць грамадства, нацыянальныя рухі — самыя глыбінныя. Гэта не проста парад суверэнітэтаў — гэта карэнныя змены ў нашым мысленні. Нацыянальныя рухі не могуць быць злом. Яны закранаюць кожнага чалавека і ўплываюць на фарміраванне новага светапогляду. Таму, на маю думку, задача універсітэта — падтрымліваць іх. Трэба ісці далей фразы і рабіць канкрэтную справу.

У заключэнне С. А. Малевіч абвясціў канкрэтныя тэрміны выканання тых задач, аб якіх вялася размова.

ЖАНЧЫНА ЖАНЧЫНУ СУСТРЭЛА

# «Мінулае свята радавала больш...»

**Многія лічаць усіх жанчын без разбору балбатухамі-пляткаркамі і не любяць іх слухаць. Але на свята — нікуды не дзецца — прыйдзецца пабыць больш уважлівымі. Можа, менавіта 8 Сакавіка працаўнікам жаночых размоў давядзецца прызнаць, што там даволі часта сустракаюцца слушныя думкі?**

**Напярэдадні свята пяць жанчын нашага універсітэта адказалі на аднолькавыя пытанні «БУ». Аказалася, што і ў прыбіральшчыцы, і ў студэнткі, і ў выкладчыцы савецкай ВНУ такія падобныя праблемы...**

***1. Успомніце, калі ласка, свой мінулагодні настрой напярэдадні 8 Сакавіка. Ці адрозніваецца ён ад сёлетняга?***

***2. У якіх жыццёвых сітуацыях Вы адчуваеце сябе асабліва зняважанай як жанчына?***

***3. Чаму б Вы аддалі перавагу: захопленым позіркам мужчын ці дэфіцытнаму тавару ў Вашай цяжкай сумцы?***

***4. Якую калектыўную характарыстыку Вы можаце даць мужчынам універсітэта?***

Любоў Захараўна **ГРЫБАВА**, швейцар:

1. Напярэдадні мінулагодняга 8 Сакавіка ў мяне быў больш святочны настрой, чым зараз. Чакала свята, вясёлага застолля — на жаль, толькі ў святы можна сабраць разам усю сям'ю, запрасіць у госці родных. Сёлета зусім іншае. Толькі паўсюдны дэфіцыт, дэфіцыт, дэфіцыт...

2. У якой яшчэ сітуацыі жанчына можа адчуваць сябе больш зняважанай, чым у асяроддзі грубых і няўважлівых мужчын?

3. У сваім узросце ў цяперашні час я, зразумела, аддала б перавагу дэфіцытным рэчам у сумцы, чым статнай паходцы і захопленым позіркам мужчын-пенсіянераў.

4. Адказаць на гэта пытанне мне цяжкавата, бо, зноў жа з нагоды свайго ўзросту, я ўжо стараюся не вельмі прыглядвацца да мужчын. І ўсё ж пэўная думка наконт іх у мяне ёсць. Гэта прыстойныя і культурныя людзі.

Алена **СУВОРАВА**, студэнтка 2 курса юрыдычнага факультэта:

1. На лёгкае, на першы погляд, пытанне адказаць не так ужо і проста. Мне, як любой маладой дзяўчыне, заўсёды хочацца ўспамінаць толькі прыемнае, добрае. Але сёння, на жаль, няма той радасці чакання свята.

2. Такімі «сюрпрызамі» жыццё мяне яшчэ не радавала. Хочацца спадзявацца, што так будзе і ў будучым.

3. Шчыра кажучы, не пашкодзіла б ні тое, ні другое. Але калі вы ставіце мяне перад выбарам... Нягледзячы на ўсе цяжкасці нашага жыцця, я ўсё ж такі аддала б перавагу першаму — ці не аб гэтым марыла кожная жанчына ва ўсе часы, а дэфіцыт, спадзяюся, з'ява часовая.

4. Ва універсітэце я толькі паўтара года. Але і за гэты кароткі час паспела заўважыць, што мужчыны універсітэта валодаюць сапраўдным розумам, надзвычайнай кампетэнтнасцю, ветлівасцю, тактоўнасцю, павагай да жанчын, нават (у асобных выпадках) пачуццём гумару. Спіс можна было б прадоўжыць, але гэта галоўнае. Карацей, нашы мужчыны мне падабаюццца (магчыма таму, што іншых я не сустракала).

Аляксандра Сямёнаўна **ПАЎЛЮЦЬ**, прыбіральшчыца:

1, 2. Безумоўна, год назад 8 Сакавіка было больш святам, чым сёлета. Засталося да гэтага дня зусім нямнога, а я не знайшла пакуль падарункаў ні для сваёй маці, ні для дзвюх дачок, ні для дзвюх унучак. У іх, да таго ж, і дні нараджэння ў сакавіку — ва ўнучак маіх. Дык што ж можа больш зняважыць дачку, маці і бабулю, чым немагчымасць зрабіць прыемнае сваім родным?

3. Зараз для мяне больш важна другое. Асабліва, каб гэтым дэфіцытам у маёй сумцы быў прыгожы плашч ці добрыя боты, якія немагчыма купіць,— вось тады і можна было б падумаць пра позіркі мужчын...

4. У параўнанні з большасцю тых мужчын, што бачу звычайна на вуліцы, універсітэцкія, як здаецца мне, больш культурныя, ветлівыя і тактоўныя. Я ніколі не чула ад іх ні мацюкоў, ні лаянкі. Таму ва універсітэце прыемна працаваць.

Людміла Пятроўна **САЯНКОВА**, кандыдат філалагічных навук:

1. Настрой сапсаваны наогул. Не таму, што здарылася нешта дрэннае ў асабістым жыцці, а з-за розных непрыемных знешніх фактараў. Нягледзячы на добрае надвор'е, восень на душы...

2. Асабліва дрэнна адчуваю сябе, калі сустракаюся з грубасцю, калі навокал адсутнічае атмасфера жаночага камфорту.

3. Я, безумоўна, аддаю перавагу першаму. Мяне наогул больш цікавіць эфемерна-рамантычнае, чым канкрэтна - матэрыяльные (хоць у нашы дні такое прызнанне можа падацца няшчырым). Такія дробязі, як тактоўны жэст, прыемная ўсмешка, добразычлівы погляд — паслы дабра людзям ад людзей, таму яны здаюцца мне больш важнымі, чым канкрэтныя прадметы.

4. Я б не ўзялася за стварэнне калектыўнага партрэта мужчын універсітэта. Мне здаецца — няхай гэта нікога не пакрыўдзіць — што нічым асаблівым яны ад іншых не адрозніваюцца. Звычайна бытавыя цяжкасці больш адбіваюцца на жанчынах. Але ў наш час жыццёвыя праблемы зрабілі і мужчын марнымі, дробязнымі, агрэсіўнымі, няўважлівымі. Светлых асоб сярод іх мала, нават ва універсітэце. Менавіта так — каб і асоба была, і святло. Звычайна, на жаль, ні таго, ні другога...

Напярэдадні жаночага свята хачу пажадаць нашым мужчынам часцей прыносіць радасць тым, хто жыве побач.

Ірына Вікенцьеўна **ШАБЛОЎСКАЯ**, доктар філалагічных навук, прафесар:

1. Апошнія гады настрой у нас, на жаль, не мяняецца. У мяне няма прычын чакаць 8 Сакавіка. Калі раней гэты дзень сапраўды быў святочным (мужчыны віншавалі жанчын, імкнучыся зрабіць гэта весела і цікава), то зараз ён самы звычайны. Мы страцілі формы зносін дзеля радасці.

Мне здаецца, зараз уся наша краіна знаходзіцца ў стане стомленасці, а жанчыны адчуваюць гэта асабліва: увесь цяжар нашай эканамічнай і палітычнай нестабільнасці кладзецца на іх плечы.

2. Я выдатна памятаю свае студэнцкія гады. Мы не маглі адкрыта выказаць свае думкі, апранаць тое, што нам падабалася. Гэтак было і пазней, а аднойчы на пасяджэнні вучонага савета разглядалася нават пытанне: ці пускаць студэнтак на лекцыі ў штанах? Я лічу гэта знявагай чалавечай годнасці. Напэўна, таму не асуджаю сёння кідка апранутых маладых людзей, бо не столькі пустыя паліцы магазінаў пужаюць мяне, колькі апустошаныя душы людзей.

3. Думаю, калі б у маёй сумцы былі дэфіцытныя тавары, то погляды мужчын былі б накіраваныя менавіта на яе. Але я хацела б наогул не насіць сумак і ўсялякіх цяжкасцей. Узрушаных поглядаў мужчын, мне так здаецца, патрэбна сцерагчыся, таму што за захапленнем абавязкова ідзе зайздрасць.

Мяне заўсёды радуе не захапленне і абажанне, а радасць і інтарэс у вачах маіх слухачоў. Гэта галоўнае.

4. Звычайна мужчыны універсітэта ўвасабляюцца ў тых канкрэтных людзях, з якімі мы кантактуем штодня. Наша кафедра — жаночая, таму і нейкі калектыўны партрэт намаляваць цяжка.

А калі гаварыць у цэлым, то мужчыны універсітэта крыху тэхнакратызаваныя. Яны не заўсёды здольныя заўважаць дробязі, з якіх складаецца жыццё.

*Абяззброіла. Прывітанне з усмешкай дасылае Херлуф Бідструп.*



## МУДРЭЦ СКАЗАЎ

Хто здольны кіраваць жанчынай, здольны кіраваць дзяржавай.

А. БАЛЬЗАК.

Жыццё жанчыны засяроджана пераважна ў жыцці сэрца; кахаць — значыць для яе жыць; а ахвяраваць — значыць кахаць.

Меркай годнасці жанчыны можа быць мужчына, якога яна кахае.

В. БЯЛІНСКІ.

Прырода сказала жанчыне: будзь прыгожай, калі можаш, мудрай, калі хочаш, але разважлівай ты павінна быць абавязкова.

П. БАМАРШЭ.

Жанчыны ніколі не бываюць такімі моцнымі, як калі яны ўзбройваюцца слабасцю.

І. БУНІН.

Разумная жанчына — тая, у прысутнасці якой можна трымаць сябе як хочаш неразумна.

П. ВАЛЕРЫ.

Усе супрацьлегласці сходзяцца ў сэрцы жанчыны.

Ф. ВАЛЬТЭР.

У памылцы любой жанчыны ёсць віна мужчыны.

І. ГЕРДЭР.

Мужчыны ствараюць законы, жанчыны — норавы.

Ф. ГІБЕР.

Мужчыны звяртаюць увагу на тое, што пра іх думаюць, а для жанчын больш важна, што пра іх гавораць.

Т. ГІПЕЛЬ.

Вышыня культуры вызначаецца адносінамі да жанчыны.

М. ГОРКІ.

Усё сучаснае выхаванне жанчыны накіравана на тое, каб замкнуць яе жыццё на любоўных эмоцыях. Адсюль гэтыя «разбітыя сэрцы» гэтыя паніклыя ад першага бурнага ветру жаночыя вобразы. Трэба расчыніць перад жанчынай шырокія вароты ўсебаковага жыцця, трэба закаліць яе сэрца, трэба браніраваць яе волю. Час навучыць жанчыну браць каханне не як аснову жыцця, а толькі як прыступку, як спосаб выявіць сваё сапраўднае Я.

А. КАЛАНТАЙ.

Мужчына цешыцца шчасцем, якое зведвае, жанчына — шчасцем, якое прыносіць.

П. ЛАКЛО.

Самая моцная вада ў свеце — жаночыя слёзы.

Д. МОРЛІ.

Усё ў жанчыне — загадка, і на ўсё гэта ёсць адна разгадка: цяжарнасцю завецца яна.

Ф. НІЦШЭ.

Царства жанчыны — гэта царства пяшчоты, тонкасці і цярпімасці.

Ж.-Ж. РУСО.

Калі душа наша чыстая, слова «жанчына» поўнае для нас велічы.

Э. СЕНАНКУР.

Няма нічога лягчэй, чым, ператварыць пасрэдную жанчыну ў жанчыну выключную. Дастаткова яе пакахаць.

М. САВАЖОН.

Там, дзе ёсць строгасць і патрабавальнасць жанчыны, дзяўчыны, юнак становіцца сапраўдным мужчынай.

В. СУХАМЛІНСКІ.

# «Біялагічныя машыны» супраць «цывілізацыі мужчын»

Жыццё ў грамадстве ў лепшым выпадку — дзікая нудота. Само ж грамадства ніякім сваім бокам не датычыцца жанчын. Грамадска-свядомай, адказнай, якая шукае моцных адчуванняў жанчыне застаецца толькі скінуць урад, знішчыць грашовую сістэму, усталяваць поўную аўтаматызацыю і ліквідаваць мужчынскі пол.

Т.- Г. АТКІНСОН,
«Радыкальны фемітум»,
зборнік «Жаночае вызваленне».

Валеры Саланіс — адзіны член заснаванага ёю «Грамадства па ліквідацыі мужчын» (першую сваю ахвяру ёй удалося параніць).

Зараз, калі размнажэнне без удзелу мужчын і ўзнаўленне адных толькі жанчын стала тэхнічна магчымым, мы павінны прыступіць да ажыццяўлення гэтай задачы неадкладна. Мужчына — біялагічная выпадковасць: У-ген (мужчынскі) ёсць няпоўны Х-ген (жаночы), гэта значыць ён уяўляе сабой няпоўны набор храмасом. Іншымі словамі, мужчына — гэта незакончаная жанчына...

Валеры САЛАНІС,
маніфест «Адзінства сясцёр — гэта сіла».

Быць у капкане фізічнага прызначэння адпаведна смерці асобы... Будова цела не павінна болей вызначаць духоўнае жыццё асобы.

Калі дух не кіруе целам, яно не больш, чым машына. Дык чаму ж не замяніць яе сапраўднай машынай?

Пісьменніца Джойс
Кэрал ОУТС,
часопіс «Атланцік».

ПРЭС-КІРМАШ

## ЗАХАВАЕМ МУЖЧЫН

Першы ў Даніі цэнтр для аказання маральнай і матэрыяльнай дапамогі мужчынам, якія церпяць фізічныя і псіхалагічныя пакуты з боку сваіх жонак, адкрыўся ў партовым горадзе Харсэнс. Як сцвярджае саветнік цэнтра Свен Іенсбі, «тысячы датчан пакутуюць ад пабояў і зняваг супруг, аднак баяцца паскардзіцца на свой нешчаслівы лёс». «Магчыма, гэта самае вялікае табу ў нашай краіне»,— гаворыць ён.

«ІНТЭРНЭШНЛ ГЕРАЛЬД ТРЫБЮН»

## ПРЭЧ З ДАРОГІ

**Урад Саудаўскай Аравіі абвясціў, што з гэтае пары на тэрыторыі краіны ўсім жанчынам забараняецца знаходзіцца за рулём аўтамабіляў. Улады папярэдзілі, што на ўсіх, хто парушыць гэты загад, будуць накладзены сур'ёзныя санкцыі. Якія менавіта, не ўдакладняецца. Прыняты закон распаўсюджваецца як на падданых каралеўства, так і на іншаземак.**

«РЭЙТЭР»





## І ўсё ж такі яна круціцца

**Сярод шэрані будзённых клопатаў, скрозь лаянкавае павуцінне чэргаў ідзе ЯНА да сваёй мары — быць каханай і самай прыгожай.**

**Пяшчотная. Недасягальная. Непрадказальная. Замілаваная. Пакрыўджаная. Стомленая...**

**І ўсё ж такі ЯНА круціцца. Не толькі на «мужчынскай» пасадзе і завіхаючыся на кухні. Ля люстэрка і ў віхуры танца таксама.**

**Час закранае ЯЕ: пачырванелыя ад бяссоннай ночы вочы, шурпатыя рукі, сагнутыя плечы і... чароўная ўсмешка.**

**І ўсё ж час неўладарны над ЁЙ.**

**Крыўднае слова не дасягне вышыні ЯЕ.**

**Бо імя ЁЙ — ЖАНЧЫНА. Сугучнае з жыццём.**



## СКАРБОНКА КАРЫСНЫХ ПАРАД

# Дарыце жанчынам кветкі

**...Зайграла чароўная музыка. Муж падышоў да мяне, працягнуў букет руж... і запрасіў на танец. Гэтыя некалькі хвілін, калі мы кружыліся пад мелодыю вальса, прынеслі нам сапраўднае шчасце, а сэрцы напоўнілі пяшчотай і любоўю.**

Напярэдадні 8 Сакавіка кожны мужчына заклапочаны значна больш, чым у звычайныя дні. Шкада толькі, калі хто-небудзь з іх пошукі падарунка ўспрымае як павіннасць і адносіцца да яго выбару як да простай фармальнасці — такое віншаванне наўрад ці прынясе чалавеку радасць.

Такім чынам, вы з адчаем бегаеце па звыкла пустых магазінах у пошуках падарунка для маці, жонкі, каханай... «Што купіць?» — ламаеце сабе галаву. Магчыма, дарэмна? Прабягаючы па падземным пераходзе, зазірніце ў тэатральную касу — а раптам пашанцуе, і ў святочны вечар ваша жанчына, нарэшце, знойдзе хвілінку для сябе.

Што ж датычыць звыклай формы падарунка, калі вы чалавек жанаты, бойцеся атрымаць ад жонкі наганяй за транжыранне грошай і лепш парайцеся з ёй. Можна нават купіць падарунак разам. Але гэта ў крайнім выпадку.

Каханай лепш за ўсё дарыць кветкі. Не надумайцеся паднесці ёй прадметы інтымнага туалета або адзенне ці абутак — гэта нетактоўна, хоць у наш час актуальна.

Ніколі не варта рабіць падарункі ананімна — вы паставіце чалавека ў няёмкае становішча. Ды і, напэўна, мала якая жанчына асмеліцца ўзяць такі падарунак, гэтым самым, відаць, пакрыўдзіць і вас. Выключэнне складаюць толькі кветкі, якія падносяць звычайна жанчынам. Яны не пагр止шаць супраць правілаў добрага тону, прыняўшы гэты прыемны знак увагі. Дарэчы, калі вы дарыце кветкі, як кажуць, з рук у рукі, абавязкова зніміце з іх фальгу.

Барані вас божа, калі надумаецеся загарнуць падарунак у газету. Выберыце прывабную ўпакоўку па свайму густу. Лепш зрабіць так, каб падарунак не быў бачны. Асабліва прыемна, калі ён, як кажуць, з «ізюмінкай». Які сэнс укладзяце вы ў падарунак — гэта ўжо справа вашай вынаходлівасці, пачуцця гумару. Для гэтага выдатна было б хоць крыху ведаць чалавека, яго звычкі і схільнасці.

Карацей, вам абавязкова патрэбна быць крышачку ўважлівым, і вы абавязкова даведаецеся, што можа асабліва парадаваць таго, каму вы хочаце зрабіць сюрпрыз.

З. МІХНЕВІЧ.

## НА КІЛІМ!

# КАЛЭНЕЦІКС

***У святочныя дні вы павінны быць асабліва прыгожымі. Таму не след забывацца і 7, і 8 сакавіка на гімнастыку. «Калэнецікс» падорыць вам адчуванне бадзёрасці, маладосці і радасці. Сёння мы друкуем заключныя практыкаванні гэтага комплексу (пачатак у №№ 1, 4, 5).***

Цяпер трэба стаяць перад крэслам на каленях. Левая нага выпрамлена ў калене і выцягнута ўбок. Трымаючыся за крэсла, нахіліся ўбок так, каб плечы былі прамымі. Потым павярні левую нагу, калена і ступню ў напрамку падлогі. Не мяняючы пазіцыі рук на крэсле, перасоўвай левую нагу ўправа ў напрамку цела, але не згінаючы пры гэтым нogі. Расслаб правае калена, каб зменшыць супраціўленне. Зараз трэба напрагчы ягадзіцы і выштурхнуць таз наперад больш, чым ты лічыш магчымым для сябе. Плечы акруглены наперад. У гэтай пазіцыі паднімі левую нагу не менш чым на 6 см над падлогай. Патрымай хвіліну і апусці. Паўтары 100 разоў, па 50 разоў з кожнага боку. Спачатку гэта будзе нялёгка. Але будзь настойлівай і не перажывай!

Наступная група практыкаванняў — для ягадзіц і клубаў. Вы ведаеце, многія незадаволены сваёй фігурай менавіта з-за гэтых частак цела. Практыкаванні, што даюцца ніжэй, вельмі эфектыўныя для ягадзіц і клубаў, але адначасова яны ўздзейнічаюць на верхнюю частку спіны і плячэй.

1. Сесці тварам да крэсла на левую ягадзіцу. Левая нага сагнутая ў калене, пятка на ўзроўні крока. Правая нага выцягнута ўправа і сагнута ў калене назад. Правая ступня расслабленая. Трымаем крэсла левай рукой, а правую трэба пакласці на клуб. Адначасова прыцісні правае калена да падлогі. Правая ступня пачынае адрывацца ад падлогі. Пакладзі правую руку на крэсла і не дазваляй праваму клубу рухацца назад. Паспрабуй злучыць ягадзіцы, таз штурхні наперад, спіна прамая (спачатку будзеш нахіляцца і сутаргава хапацца за крэсла). Паднімі правае калена не ніжэй чым 6 см над падлогай, павярні нагу назад на 2 см, не мяняючы становішча клубаў і таза. Свабодна вярніся ў пачатковую пазіцыю (або на 2 см наперад). Соўвай мякка нагой наперад і назад. Паўтары 100 разоў.

Табе прапануецца выканаць 20 рухаў з аднаго боку, потым змяніць пазіцыю і зрабіць 20 разоў з другога боку. Такім чынам давесці да 100. Калі адчуеш стому, адпачывай, выконвай столькі разоў, колькі здолееш. Калі боль будзе ісці ўверх ад клуба да таліі — не хвалюйся. Проста ў цябе слабыя мышцы.

2. Пачатковае становішча тое ж: правая нага ляжыць, вольна выцягнутая ў правы бок. Накіруй рукой правы клуб наперад, напражы ягадзіцы і выштурхоўвай таз наперад. Паспрабуй так павярнуць нагу, каб пальцы ног удавіць у падлогу. Не блакіруй правае калена. Плечы расслабленыя. Трымай клуб накіраваным уперад. Паднімі правую нагу не вышэй чым на 7 см над падлогай. Пратрымайся хвіліну ў гэтай пазіцыі. Нават калі не можаш парушыць нагой, паспрабуй. Не расчароўвайся, нарэшце гэта атрымаецца ў цябе. Эфект будзе надзвычайны!

## ПАМІЖ НАМІ, ДЗЯЎЧАТАМІ

*Не будзем хітраваць: гэта толькі для мужчын мы здольныя сумяшчаць у сабе мужнасць і пяшчоту, вынослівасць і прывабнасць, разважлівасць і легкадумнасць. Магчыма, таму, што яны прыстасаваліся да ролі назіральнікаў за нашымі дзеяннямі. Так ім лягчэй жыць.*

*Але ж нам з вамі вядома: зморшчынкі з'яўляюцца на твары зусім не ў радасныя хвіліны жыцця, а ў тыя самыя, калі як раз час паскардзіцца ў лісце лепшай сяброўцы...*

# Пакуль не ўсё страчана

Табе ніколі не прыходзіла ў галаву, што дома, чаго ніколі не здараецца на рабоце ці ў кампаніі сяброў, ты выглядаеш несімпатычнай дурніцай? Павучанні і натацыі выплёскваюцца на дзяцей, бясконцыя прэтэнзіі і шэраг дробязных праблем быццам бы ўвесь дзень назапашваюцца для мужа. Толькі не крыўдуй. І не след мне нагадваць, што ты даўно набыла вучоную ступень. Я, безумоўна, пра гэта памятаю. Як і пра твае горкія слёзы ў тэлефоннай трубцы, калі выхавацельніца не зусім тактоўна паведаміла, што пяцігадовая Леначка ў адказ на пытанне «Чаго на свеце не бывае?» намалявала цябе, тату і сябе з шырокімі ўсмешкамі — рот да вушэй, хоць пасачкі прышый. У цябе гарэла кандыдацкая, у мужа — план. А тут яшчэ гэтыя непрыемнасці. «Хіба ёй не хапае сумесных паходаў на выстаўкі, білетаў у тэатры і на святочныя прадстаўленні? Няўжо бабуля горш за мяне чытае казкі?» — пыталася ты. Так у тваёй Леначкі было больш за неабходнае для падтрымання жыцця. І не хапала бацькоўскага цяпла. Ты злавалася, а Леначка здзіўлялася: яна была шчырая ў думках і дзеяннях і не ведала, зручна ці нязручна гэта па правілах дарослых. Дарослыя ведаюць, каму можна адкрываць свае таямніцы, і забываюцца, што дзіця пазбаўлена падобнай інтуіцыі, не можа быць ветлівым і вясёлым або ціхім па загаду. Сёння на двары сонейка — як устрымацца ад песенкі? Заўтра дождж — толькі і застаецца, што маляваць: а пад руку трапіла папера з чарнавіка мамінай дысертацыі.

Так, сацыёлагі падлічылі, што сучасная жанчына траціць на выхаванне дзяцей 17 хвілін у дзень. Хочаш — не хочаш, прыходзіцца нервавацца і злавацца, калі гэты неслух усё робіць наадварот. А як яму непрыемна пазіраць у нашы злосныя вочы, ты падумала? Зразумець нас цяжка, запытацца нельга.

Я заўсёды знайду табе апраўданне: асноўныя нашы намаганні па-за домам, а для родных застаецца стома, нервовасць, дрэнны настрой. Хіба ты хочаш праз некалькі гадоў убачыць такой сваю Леначку? Ці Валерыка, якога пакуль выхоўвае маці мужа? Разумееш, так нельга, каб на першым месцы была доктарская, на другім — лекцыі, на трэцім — падрыхтоўка да іх.

А я набыла кнігу «Аб смачнай і здаровай ежы» (гатую для сваіх мужчын самыя мудрагелістыя стравы), камплект выкраек (Танюша так радуецца новай сукенцы) і душэўны спакой (як добра, калі ты не абстрактная вытворчая адзінка для многіх, а надзвычай патрэбны чалавек для траіх блізкіх). Так што, пакуль не ўсё страчана, давай супраціўляцца з усіх сіл гэтаму раўнапраўнаму запрыгоньванню.

Г. З.











# Толькі сном адзіным...

...Сніцца і сніцца мне адзін і той жа сон. Я еду ў бясконцым вагоне па бясконцай лініі метро. Адзіная пасажырка сярод мужчын. Яны, як адзін, паголеныя, у начышчаным да бляску абутку і з кветкамі ў руках. Калі я ўвайшла, разам падскочылі са сваіх месцаў, прапануючы мне сесці, хоць і так было дзе. Я апынулася побач з двумя сябрамі, якія ажыўлена размаўлялі. Адзін стаяў спіной да мяне, але хуценька развярнуўся і папрасіў прабачэння. А размаўляць яны адразу сталі больш стрымана. Другі мой сусед ніжэй апусціў газету, якая хавала ўсю яго постаць, і перамяніў сваю позу на найбольш прыстойную. Усе, хто кідаў позіркі ў мой бок, ветліва ўсміхаліся пры гэтым, быццам позіркі не кідаліся, а падносіліся мне з паклонам. Яны давалі мне адчуванне, што я самая прывабная жанчына ва ўсім свеце. Вельмі прыемна было ехаць у тым вагоне...

Перад выхадам мне прапанавалі трымацца за самы зручны поручань і дазволілі выйсці першай. Але потым усе мае спадарожнікі апынуліся наперадзе. Крыху пазней я зразумела, у чым справа: яны спяшаліся адчыніць і патрымаць цяжкія шкляныя дзверы. Спыніць іх спешку змагло адно невялічкае здарэнне: я незнарок абраніла пальчатку. Нават і ўсвядоміць гэтага не паспела, калі некалькі мужчын кінуліся паднімаць яе. Яны не сутыкнуліся, уступілі права аказаць мне паслугу таму, хто зрэагаваў першым. З якой тактоўнай усмешкай падаў ён мне маю пальчатку! І хацеў нават руку пацалаваць, але раптам... Станцыя метро стала напаўняцца жанчынамі. Іх было вельмі многа, процьма. Яны ішлі жывой сцяной, заклапочаныя, з цяжкімі і вялізнымі сумкамі. Імгненна зніклі ўсмешкі з твараў мужчын, стаў брудным іх абутак і пакамячыліся касцюмы. Жах апанаваў мяне, і я прачнулася...

Спачатку з пачуццём злосці на гэтых жанчын: не з'явіся яны, мужчыны засталіся б ветлівымі і тактоўнымі. А потым падумала, што гэта, магчыма, і ёсць выйсце: размеркаваць усіх мужчын на групы і замацаваць за кожнай з іх па адной жанчыне. Няўжо не здолеюць яны якасна заляцацца да яе? Але ж жанчын у нас больш, чым мужчын, і больш нічога я прыдумаць не змагла. Можа, ты, сяброўка мая даражэнькая, ведаеш, што ж рабіць нам, небаракам, каб прымусіць мужчын не толькі 8 Сакавіка быць уважлівымі?

В. С.

